Іна Снарская

Кветка Гарынь

Вершы

Палтава
«Друкарська майстерня»
2005

УДК 821.161.3-1
84.4(4Бел)6-5

Снарская І. Кветка гарынь: вершы. — Палтава: Друкарська майстерня, 2005. - 192 с

ISBN 966-8798-01-5

Кветка Гарынь — чарадзейная лясная кветка. Пяшчотная і мужная, яна гарыць - не згарае, пераадольвае спякотнае лета і лютую зіму, нішчыць праклёны і самотнасць, абыякавасць і няшчырасць. Гэта чароўная кветка ведае мову птушак і ветру, галінак дрэў і збажыны. Кветка Гарынь загаворвае хваробы і загойвае раны душы. А расце яна на «срэбным узмежку» сэрца паэта.
Іна Снарская — выхаванка Полацка і жыхарка Палтавы. Яе кніга «Кветка Гарынь» — удзячнасць беларуска-ўкраінскаму свету.

Я звяроў вучыла размаўляць...

Паэткі. Яны — маладыя сваячкі ведзьмаў. Позіркам вецер запыняць, словам дождж паклічуць. Слова можа ўсё. Слова слухаецца таго, хто слугуе яму. Слова роднае з-пад сэрца матчынага.

Іна Снарская. Паэтка са слаўнага месца Полацка. З шляхетнага роду. Пра паноў Снарскіх узгадвае Ян Баршчэўскі ў сваёй кнізе «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях».

Іна Снарская - паэтка апантаная, утрапёная. Вершы жывуць у ёй... Вершы прыходзяць да паэткі ў вешчых снах. А сны вешчыя Полацк упадабаў яшчэ ў сівую даўніну. Гэта ў Полацку княжыў Усяслаў Чарадзей. Памятаеце, у «Слове пра паход Ігаравы»:

Яму ў Полацку пазвоняць ютрань рана
ў званы ў святое Сафіі,
а ён той звон чуе ў Кіеве.

Полаччына дала Іне Снарскай трапяткую душу, неўтаймаваную думку й прыгажосць, прыгажосць таленавітую...

Лёс паклікаў паэтку на Украіну, як некалі генія роднай літаратуры Уладзіміра Караткевіча, таксама ўраджэнца Полаччыны. Туга па радзіме спакон вякоў прасілася перадаць яе вершамі. І, як птушкі з выраю, лятуць дадому акрыленыя радкі Іны Снарскай. Паэтка моліцца словам,

паэтка моліцца Беларусі. У паэзіі Іны Снарскай шмат таемнага, падсвядомага, шмат нечаканага й трымтлівага. І калі яна кажа: «Я звяроў вучыла размаўляць», не ўспрыймаеш гэта як нейкі паэтызм, а верыш у дасканаласць сказанага.

Самы, відаць, няўдзячны занятак — гэта пераказваць вершы, тлумачыць, пра што яны. Сапраўдныя вершы нельга пераказаць, іх трэба чытаць, калі трэба, запамінаць, удыхаць, як паветра. А вершы Іны Снарскай сапраўдныя, яны нашаптаныя ёй самой вядзьмаркай Паэзіяй.

Чытаў я вершы Іны Снарскай, святлеючы душой ад ранішняй чысціні маладой паэзіі, і не ўтрываў, каб не напісаць колькі радкоў у рыфму ў гонар адметнай паэткі.

Чытаю: Іна — і на
Імгненне ціхае нейкае
Пачую, як даўніна
Іначыць усё і некае.

Не! — кажа забыту вякоў
Шляхетнага роду цяцівіна.
І мутныя вочы крукоў
Святлеюць — з смеласці дзівяцца.

І памяць кросны снуе,
І лесуны барукаюцца.
Шляхі разышліся яе
З бязроднымі выраканцамі.

У прышласць цячы шпарчэй
Грамнічная кроў крывіцкая!
Сінечу іконных вачэй
Сабачая зграя не выцкуе.

У Полацку ціхнуць званы.
Пан Гром пярсцёнак ёй
З мар скуе.
І сняцца вешчыя сны.
Яна ж недарэмна
Снарская!

Рыгор Барадулін,
народны паэт Беларусі

* * *

Мая зямля — гаючы бінт на целе,
І гэты скарб завешчана храніць.
Я сіні лес, жывых крыніц адценне,
Халоднымі начамі буду сніць.

Дзе зліва мне падманы наварожыць,
Дзе груганнё схавае капяжы,
Зямля травой, зямля сцяжынкай
кожнай
Мне наканue верыць, марыць, жыць.

* * *

Душу бяссонную маю
Ратуюць дрэвы.
На сёмым небе іх прыют,
Адзіны бераг.

На сёмым небе іх спакой.
Не б'е пад сэрца
Калянай вогненнай рукой
Шалёны вецер.

Не разрывае на шматкі
Галіны-лёсы.
Там за хвілінамі вякі
Цякуць у восень.

Там карані, як паясы, —
Не страшна ўмерці.
Мяне завуць мае лясы
На мове сэрца.

* * *

Сіняй сцяблiны кранаецца ветах —
Сёння трыпутнік стане сусветам.
Будуць суквеццем доўгія ночкі,
Зорныя нівы — зорным сыночкам.

Сённня трыпутнік стане сусветам.
Кветка цвіце, нібы волкае лета.
Нам гэты шлях і спяваўся, і сніўся:
Стромыя сосны, сінія нівы.

* * *

Мой шалёны каханы — вецер:
Лашчыць плечы, кудлаціць косы,
Закалыхвае вочы кветкамі,
Зацалоўвае ногі босыя.

Мой адчайны каханы — вецер,
Ты адкуль прыляцеў на звабу?
Уварваўся ў самотны вечар
І сукенку дарыў з ядвабу.

Мой адзіны каханы — вецер,
Падарунак нястрымна-пяшчотны.
Нам з табой, мабыць, поўня даверыла
Гэта неба, і вечнасць, і сосны...

Дождж

1
Неба ўздыхнула —
 і дождж нарадзіла.
З дзіравага меха — дзіцё
Цешалася, пакуль дзіва
Дзяліла з намі жыццё.

Цешалася, пакуль цацкі
Былі як жывыя, і мы
Лёталі ў гэтай пяшчоце вар'яцкай
Далёка ад грэшнай зямлі.

Млела, лілося дарогамі дзіва.
Дзе дыванамі зара.
Рукі раскінула велічна зліва
Злева ад сэрца,
ў барах.

2
Лівень, лівень летам, летам
Наталяе цеплынёй,
Ён, тварэц зямлі паэтаў,
Тчэ па ноце голас мой.

Лівень, лівень летам, летам...
Я лячу за ім услед,
На адной сцябліне — ветах,
На другой — увесь сусвет.

Лівень, лівень летам, летам
Лёнам, лёнам спавіваць...
Лётай, птушка, белым светам
Пакуль свеціцца трава.

* * *

Дом стары цягне рукі да белага хлеба,
Косы жоўтыя гладзіць зямлі.
Дождж ліецца.
Я вусны падставілі небу.
Блаславіла палі.

Прыняла гэты боль,
Нібы шчасце-спакусу
Быць краплінай ва ўсім,
Сніць сусвет у сабе...
Так пунцова гарацць мае горкія вусны
Не скаруся журбе.

* * *

Кветка Гарынь — гарачая,
Гнуткая, як струна,
Гняўлівы дзень перайначвала,
Струмянела, цякла.

Кветка Гарынь гарэла
Кожным пялёсткам сваім,
Шалам душы і цела —
Адценнем маці-зямлі.

Захлыналася кветка ў пяшчоце —
Цішыні збавення майго
І таго, хто сядзеў напроці
Таямнічых снягоў.

* * *

Вядзі мяне ў свой сіні сад,
Там восень правіць баль.
Яе нясцерпная краса,
І боль яе пагляд.

Глядзі: у вокнах па расе
Сцякае цень ракі.
Вядзі мяне ў свой сіні сад,
Дзе вецер п'е з рукі.

Кіпіць, буяе там жыццё,
Але брыніць туга,
Нявоціць неба пачуццём,
Што ўсё памрэ ў снягах.

* * *

Я не ўмею варажыць,
Толькі страт зямное шчасце
Прывучае проста жыць
І паклоны Богу класці.

Я не ўмею варажыць,
Дзе за ніткай скарб кладзецца.
Прывучаю не тужыць
Сваё зморанае сэрца.

І малюся дзень за днём,
Крок за крокам, век за векам...
Мае плечы ўкрыў анёл
Зорным небам, сінім ветрам.

* * *

Навекі сонца гарады
Закрытыя ад здрады цемры,
А я спяшаюся ў мяды,
У прасвятлённы зорны церам.

А там рака — нашчадак ніў
Шчасліва свеціцца зямлёю
І адмысловыя агні
Гараць у ветраках зялёных.

Лунае смех, цвітуць сады
І лёгка так, што мудрасць сэрца
Ачышчанага ад бяды
Святкуе свой узлёт над смерцю.

Маё жыццё цяпер Тваё...
На падваконні свечка цвеліць,
А я ўжо вольная ад цела
Плыву ў блакіт Тваіх гаёў.

* * *

Вугал ночы — край малітвы,
Кроў дажджу, спакой самотных.
У далонь зары наліта
Сто грахоў маіх смяротных.

Сто спакус маіх адчайных
Паяднаць душу і цела...
Там, дзе кнігаўка крычала,
Толькі свечачка ўцалела...

* * *

Белыя крылы поўні
Над небам і над зямлёй.
Поўня сусвет напоўніць
Снамі палёў.

Поўня раскажа казку
Пра лета і пра мяне...
Верце. З Божае ласкі
Шчасце не праміне.

* * *

Вы, мае ліўні,
Выпейце слёзы.
Лета смяецца,
Сонца не ўсходзіць.

Вечарам ліўні,
Як вербалозы.
Лета мінае,
Жыта не родзіць.

Вусны смяюцца,
Вочы рыдаюць.
Дайце мне, ліўні,
Сэрца са сталі.

Сэрца сталёвае
Будзе да ладу,
Калі каханне
Знікне, як радасць.

Сон

«Жизнь: ножи,
на которых пляшет любящая...»
М.Цвятаева

Рэжа, рэжа сон мой нож.
А сівая ведзьма-ноч
Прыгаворвае, сычыць:
«Калі любіш, то маўчы».

Гэты нож — толькі ноч.
Гэты нож зваліць з ног.
«Ты, дзяўчынка, маўчы,
Калі сэрца крычыць».

А на дрэве — гарнастаі.
А на небе зоркі ўсталі...
Дзе ўзяліся нажы,
Ты мне, ночачка, скажы.

Тут нажы і там нажы,
Як жа мне кахаць і жыць?..
Снег па полю тужыць,
Значыць будзе сцюжа.

* * *

Першы снег, як воўк галодны,
Рана, рана на палі.
Ты самотны, ты бязродны,
Без цябе душа баліць.

Воўк мой — снег, сляпое лісце
Зноў ад холаду дрыжыць.
Так і я сама калісці:
Выжываць — амаль не жыць.

Выжываць самотай ў сэрца,
Выць, калі агорне жах,
А каб з голаду не ўмерці —
Па чужых блукаць дварах.

А душа душою тужыць,
А душа душой баліць...
Белы воўк палямі кружыць
І не ўмее гаварыць.

Ваўкалака

Я звяроў вучыла размаўляць,
Я чытала ім лісты і кніжкі, —
Ды глядзелі вочы ваўчанят
Праз мяне ў сусвет лясны, няблізкі.

Я звяроў вучыла маляваць,
Ім палітру падбірала з неба
І з дажджом мяшала зарапад...
А яны жадалі толькі хлеба.

А спявалі мы амаль адно:
Калі поўня адчыняла вокны,
У вачах сляпучае сяйво
Адбівалася абразам воўчым.

Як сірочы плач хістаў зямлю,
То выццё ваўчынае сціхала:
Я спявала песню не сваю,
Ваўкалакам выла і стагнала.

Я спявала, а вакол ваўкі
Абарону ланцугом трымалі,
Калі людзі з-за маёй ракі,
Як на ловы груганнё склікалі.

Як на ловы, як на вечны скон
Замаўлялі мне хаўрус сабачы...
А ваўкі не разумелі слоў,
Толькі разумелі голас плачу.

Я звяроў вучыла размаўляць.
Я людзей прасіла спачуваць...

* * *

Павольна дыхае зара
На адзічэлы след.
Пагляд ваўка — з агню сляза,
У ёй — увесь сусвет.

Пагляд ваўка трывожыць ноч
І слепіць вочы дню.
Кашуля падае да ног
Ахвяраю агню.

Спачатку памяць запішу,
Як выйду з апранах...
Ірве, ратуе зноў душу
Мой воўк, мой грэх, мой жах.

Прысушка

Маім стрэлам калёным
не спаць,
І вятрам маім —
дзверы насцеж,
Каб гарэў твой славуты спакой
На зямлі і на небе
страсцю.
Маім змеям чароўным
не спаць:
Праз іглiцу прарошчваць вечнасць
І ў пітво тваё смела ўпускаць
Мае песні
і вешчыя вершы.
Каб табе без мяне не ўставаць,
Не ўздыхнуць, не заснуць,
не ўваскрэснуць...
Маім стрэлам калёным
не спаць:
Праклінаць
і душу тваю песціць.

* * *

Па вадзе, па журбе
Рэха лета — белы лебедзь.
Я сумую па табе
І гару, як знічка ў небе.

На світанку па траве
Верасовы звон лунае:
Прарастаю ў смагу вей
Рушніковымі лугамі.

Пракавечныя муры
Забяруць цяпло і гукі
І навучаць гаварыць
Нашы вочы, нашы рукі.

* * *

Чуеце — вербы вартуюць сон.
Цішыня зацяжарыла летам.
Лётае прывід зялёных соў
Над паграніччам сусветаў.

Недзе снягі і спакуса ў вачах.
Недзе завеі.
Чуеце — вербы ўмеюць маўчаць.
Чуеце — вечар...

* * *

Дарога, кволае дзіця,
Цябе душой не наталілі,
Гарачым подыхам лісця
І прахалодай вуснаў мілых.

Дарога, сумнае дзіця,
Не плач апошнім днём завеі,
Прымі няўмольнасць адкрыцця,
Што галава твая сівее.

* * *

У далонях — дарогі лета.
Лётай, лётай прасцей,
Бо на зары сусвету
Дню карацець.

Лётай, лётай да стомы.
Потым — снягі.
Не дакранешся й да столі
Ветрам тугім.

У далонях — лясныя песні,
Сосны, сосны пяюць.
Лётай, бо неба песціць
Восенню не дадуць.

Лётай, лётай да скону...
Коціцца ў рэчку дзень,
І залатыя коні
Топяцца у вадзе.

* * *

Азёрны хлопчык, у бары
Цябе цалуе ноч.
Ты з ёй не ўспомніш да зары
Сіротцва шэрых плошч.

Ты з ёй не ўспомніш да зары
Імён людзей, багоў...
Дзе ў кроплі зорны свет дрыжыць,
Там след крыла майго.

* * *

Я буду за цябе маліцца
Адчайна, горача, без слоў,
І будзе берагам сцяліцца
Адбітак лёсу - крылле соў.

Я буду за цябе маліцца,
Хоць і не ў змозе даляцець,
Туды, дзе наш глыток сунічны
За ноч паўней і карацей.

Я буду за цябе маліцца
На раздарожжы воўчых сноў,
І светлавокім зорным ліўнем,
І бліскавіцай залатой.

* * *

Гара кідалася пад ногі,
Зару лаві.
Ліпнёвым светлавокім ліўнем
Зямля ў крыві.

Што не памерла — прысьмірэла.
Я п'ю з рукі.
А на руінах вэлюм белы —
Радкі, радкі...

Гара кідалася пад ногі,
Лаві расу.
Яе жывой, яе гарачай
Не данясу.

Гаручаю, апошняй кропляй
Ляціць зямля.
Гара кідалася пад ногі,
Нібы змяя.

Калі імгненне станіць векам,
Гарбом сівым,
Гара падставіць небу плечы,
Як херувім.

* * *

Вучуся слухаць цішыню,
Празрыстую зару.
Я канюшынаю зямлю
І неба прыбяру.

Я зберагу стамлённых вей
Шчаслівыя агні,
Калі ракою паплывем
У золкія снягі.

Калі не ўскрыкну, не сьпяю
На беразе дажджоў...
Вучуся слухаць цішыню
Імя якой — любоў.

Танец на вуглях

Гары, гары, мой танец, на вуглях,
Жыві, жыві, няўтольнае гадамі,
Дзе птушка-вечар на плячо лягла,
Дзе птушка-ноч пунцовых губ жадае.

Гары, гары, мой танец векавы,
Трымай, трымай маю душу-пярынку,
Дзе нечаканы і пяшчотны ўздых савы,
Дзе травы струмянеюць пад сурдзінку.

Гары, гары, мой танец, на расе.
Успыхне неба шчыра, палахліва,
Я таньчыць буду і таньчэць...
А ўсе пабачаць на світанку івалгу.

* * *

Адным радком памкнуўся лес да сонца,
Адной стралой урэзаўся ў блакіт.
Глыток цяпла — і пералёт бясконцы
Запоўніў небам клёны і дубкі.

Калі зіма завее дрэвам веі,
Калі мароз прастрэліць далячынь -
У сэрцы, пад карой, успыхне вера
І лес ізноў да сонца паляціць.

* * *

Неба ў далонях калыша кветкі —
Колькі бяссонных вачэй!
Мы з табой ухапілі за крылы вецер.
Нам імчацца яшчэ вышэй.

Сядзе сонца, вярбіны на захад лягуць,
Закрываваяць зямлю,
І натоліць сусвет верасовую смагу
Па жывому агню.

Мы з табой ухапілі за крылы вецер.
Сон на веях дрыжыць.
Недзе чуецца спеў, як надзея на вечнасць.
Шалёна хочацца жыць...

* * *

Дождж праліецца - стане светла душам
На чарадзейных сініх астравах.
Маё бяссонне свой танок закружыць
На гора мне і на збавенне Вам.

Мая пяшчота зёлкамі шапоча,
У золаце пшаніцы далягляд...
Дарую Вам. Я сёння Ваша прошча.
Я тое, што не вернецца назад.

Дждж

«Ціхі дождж ідзе й не сціхае.
Аж чуваць, як растуць камяні.»
Р. Барадулін

I
Ціхі-ціхі дождж зімовы.
Моўчкі слухаю яго.
Ці ад згубы ён замова,
Ці ад холаду снягоў.

Дзе нячутна лягуць кроплі
На знямоглы шэры брук,
Прарастуць гарачым роем
Сотні белых крылаў-рук.

Дзе ад каменя да сэрца
Толькі невясомы крок,
Ад світанку і да смерці -
Цішыні глыток.

2
Зімой душа, як шэры камень:
Не заспявае, не ўздыхне...
Я сёння памяць, толькі памяць.
Вякі завуць мяне.

Зімой душа, як шэры попел:
Блукае вецер, спіць зямля...
Той камень стане цёплай кропляй,
Каб не замерзла я.

* * *
Пастарайся проста выжыць.
Пастарайся даляцець
Да гарачых зор у жыце,
Да гаючых ценяў дрэў.

Пастарайся разам з ветрам
Выпіць поўню, як расу.
У тваёй далоні — вечнасць,
Вецер ўплецены ў касу.

У тваёй далоні — воля,
Поле белае буслоў...
Пастарайся проста выжыць,
Даляцець дамоў.

* * *

А кнігаўка крычала над вадой,
Мяне гукала сонечна, аддана.
А я блукала сярод сноў-мядоў,
А я была, напэўна, толькі зданню.

А кнігаўка крычала... Сон мой дзе?
Дзіцячы ветразь прытулю да скроні.
Мой Бай ідзе, стары, як свет, ідзе,
Жыццё-дзіця трымае на далоні.

* * *

Лета крылы свае дарыла,
гаварыла міламу:
— Любы мой, лётай,
так хораша ў небе.
Глеба хлеб свой дарыла,
гаварыла міламу:
— Любы мой, хлебам
адзіным жывіся, пладзіся,
толькі ўтору не рвіся.
Гара сілу сваю дарыла,
гаварыла міламу:
— Любы мой,
доляй сваёй ганарыся,
бо жывеш
паміж небам і хлебам.
Будзе так,
бо прырэчаны.

* * *

Мы выйшлі з дажджу, як з вайны,
Дзе кроў запяклася, як сталь.
Мы выйшлі з падстрэшша труны
На зорны блакітны крышталь.

Што далей — мяне не пытай.
Прароцтва вясна забярэ.
Я буду бярозы гартаць
І руны пісаць на карэ.

* * *

Пройдзе зіма пералескамі,
Небам і воўчымі сцежкамі,
Пройдзе зіма ліхаманская
Марамі, ранамі, казкамі,
Плынню глыбокай,
Песняй далёкай.
Знікне з вачэй.
У-ця-чэ...

* * *

Не гнявіся на мяне,
Мой суддзя — зямное неба.
Сыйдзе снег, усё міне,
Стану я такой, як трэба.

Толькі сёння папрашу
Як скарынку, свой світанак,
Толькі сёння саграшу
Кропляй волі развітальнай.

Снег сыйдзе, усё міне,
Час бяжыць слязой дадолу.
Не судзі, мой Бог, мяне,
Бачыш, рэжу па жывому.

Час бяжыць. Са смагі п'ю
За глытком глыток атруту.
А напіўшыся пяю
Пра мяды і пра пакуты.

* * *

Восенню сіняй, слотнай зімою —
Я твае крылы,
Ты мая воля.

Вечарам, вечнасцю, холадам, здрадай
Ты маё неба,
Я твая радасць.

Зморany сыч праляцеў над сялом...
Дзе мы з табою?..
След замяло...

* * *

Па вячэрняй па зарэ
Восень воблакам плыве.
Ветру рукі падае,
На калені па-да-е.

Да нябёс дастаць травой
І шалёнай галавой,
Залатымі косамі,
І нагамі босымі.

Толькі снегам не дастаць:
Тануць, гінуць, сумаваць...
Мёд вячэрні неспяша
Піць з каўша.

* * *

Прыбяры мяне ў белае, поўня,
Я па-царскі табе заплачу.
Толькі грудзі зарою напоўню,
Толькі птушкаю палячу.

Прыбяры мяне ў белае, пожня.
Твой трыпутнік — замова ад ран.
Там да ранку крывавіць прошча,
І ахвяра не хоча ўміраць.

Прыбяры мяне ў белае, доля.
Адалею я смагу сваю...
Вунь ідзе абрыкосавы дождж
І анёлы песні пяюць.

Радзіме

Я так хацела хораша спяваць,
Я так вучыла той урок цвярозы,
Ды вецер кветкі на лугах ірваў,
Пераплаўляў у яшму мае слёзы.

Радкі сталелі, месяц маладзеў,
І ўсё часцей звінеў вястун хаўтурны,
А я хавала вочы ад людзей,
Не заўважала ланцугоў і турмаў.

Я так хацела хораша спяваць,
Ды раптам не адчула водар ночы.
Калі ўзнялася на гарэ трава,
Схавала з гора вочы.

Навука болю — каршуновы крык.
Навука здрады - чараты і крушні.
Зямля мая, прытулак белых крыл,
Ты тужыш, тужыш, тужыш...

* *

Палячы мяне, лекар-вецер,
Можа разам з табой паляцім
У адзінае месца на свеце,
Дзе знядужаным крылам расці.

Дзе трава кранаецца неба
І сум у вачах змяі.
Ты мяне на плячах будзеш несці,
І кранацца крылом зямлі.

Там рака загойвае раны
І воўк сядае ля ног.
У руцэ маёй будзе ранак
І ва ўсім, над усім — мудры Бог.

Паляцім жа, мой дружа-вецер,
Гэты вечар — як пах віна...
Пад ліхтарамі — вербы,
А нас нідзе няма.

* * *

Той, хто народзіцца вольны, як вецер,
Вечарам сыйдзе з жыцця.
Вершы — мае паслухмяныя дзеці,
А сапсаваная я.

А нешчаслівая я. Там дзе вецце
Воўчым застыла таўром,
Я заблукала нябогаю ў свеце
І растрывожыла гром.

І разбудзіла маланку
Рэхам сівым у барах.
Той, хто прыдзе на світанку,
Вечарам ляжа ўміраць.

Той, хто прыйдзе як збавенне —
Будзе з ветрам стагнаць...
Мяне ў небе ўсё меней,
Усё больш - у снягах.

* * *

Ляціць жыццё. Зіма майструе сані.
Апошні ліст прылёг пад абразы.
Я халады сутрэну не радкамі,
А падсвядомым прысмакам гразы.

А клён палаў. Было яму так светла.
Мінуламу малюся наўздагон:
Запомніце мяне вятры і вербы,
Маю празрыстую, як сіні дзень, далонь

Запомніце шалёнай і шчаслівай,
Дзе па шчацэ не скоціцца сляза.
Я сёння ліўнем, светлавокім ліўнем
Прыйшла, каб восені
«даруй мяне» сказаць.

Бо заўтра стану пералётным снегам,
Завею ноччу паркі і сады
І нагбам вып'ю Міласціну неба —
Твае гарачыя няўлоўныя сляды.

* * *

Зіма без снегу, як без сэрца,
Гуляе смагай зноў і зноў,
І нас нясе шалёны вецер
На раздарожжа воўчых сноў.

Я гаварыць цябе вучыла
Гарачай ноччу, слотным днём,
І гаравала памяць крылаў,
І вырастала там быллё.

Чакалі снега, быццам хлеба,
Які забыўся вырасці.
Так мала сэрца сёння ў неба.
Так мала шчырасці ў жыцці.

Развітанне

На першы лёд спяшаюцца радкі,
На белы лёс і чорную дарогу.
Балючы і халодны да шчакі
Твой пацалунак, мо таўро нябогі.

Сівею з кожнай ноччу і стагоддзем.
Дзе неба шкло ўпіваецца ў сусвет,
Ты высечаны з камню, верагодна,
Ты па зіме-няволі мой сусед.

Няўдала так, крывава вечарэе,
Чарнее дрэва зрэнкай крумкача.
Ваўком старым сірочая завея
Завые і схаваецца ў вачах.

А чараўніца ноччу чаравала
І цыравала твой сярмяжны мех.
Я рэчы на падлозе раскідала,
А ў торбу паскладала смех і грэх.

І рэха, і пранізліва-пяшчотны
Апошні подых, дахі і сумёты...
Каб ад мяне па беламу пайшоў ты,
Стагналі на паперы чорным вёрсты.

* * *

Берагі бліжэй за сэрца —
Беражы.
За адзін глыток ад смерці
Ноч бяжыць.

Дзе мая лясная фея?
За сялом.
Яе плечы, яе веі
Замяло.

Берагі бліжэй за поўню —
Цышыню.
Кубак першай я напоўню.
Прыгублю.

А пасля і ты, мой мілы.
Будзе плён.
Паратунак — толькі крылы.
Белы лён.

* * *

Сіні лес расьце ля ракі —
Камень кінуты у вякі...
Вечны ўспамін
Чалавечны?

Кранаецца лес рукі...
Пакінь,
Пакінь мяне, любы мой,
Смелай.

Зменіцца час,
І пра нас
Напіша нехта радкі,
Напіўшыся ветру з рукі.

* * *

Мне вятроў сівая роспач,
Як гаючы бінт на целе, —
Вунь і птушкі паляцелі,
Вунь і неба пушчай крочыць.

Мне вятроў лясных пяшчота,
Як няўтольны подых ночы.
Не насі хусцінкі чорнай —
Сабе гора напрарочыш.

Тут зіма глядзіць на захад
Халадамі і дажджамі.
Адзінота прывакзалля
Лес спяліць, а рукі джаліць.

* * *

Пасцялю на світанку настольнік,
Наталю журавінавы свет.
Дзе стагоддзі кранаюцца скроняў,
Там імгненні гарэць у траве.

А зярнятка шукае бяссонне,
А нябёсы гукаюць зямлю.
Пасцялю я настольнік, як поўню,
Як глыток залатога агню.

Будзе ён нібы вешчая песня,
І аднойчы зіма міне...
Кубак зорнага вольнага неба
Вып'е сын, як не стане мяне.

* * *

Па зямлі зямное пройдзе:
Правы бераг, бераг левы,
А на правым - толькі поўдзень,
А на левым - толькі дрэвы.

Сёння я лягчэй пярынкі,
Бо зямное толькі сэрца.
Разам з ветрам рыну, рыну,
А чужое - рвецца, рвецца...

І спяваць... Калі да скону
Толькі вецер - ветразь золкі,
Свой палёт не ў змозе скончыць,
Бо да сонца шлях бясконцы.

* * *

Берагамі сіні сон —
Сосны.
Сто пакут і сто дажджоў
Восень.
Берагамі сіні дзень —
Дзіўны,
Дзе стагоддзі і зара —
Дымам.
Берагамі сіні лес —
Ласка.
Сонца.
Вешчая трава.
Казка.

* * *

Я песні пакіну журлівым вятрам,
А восень на згадку зарэ,
І будзе халодная гэта пара
У сне жаўруковым гарэць.

І будзе няўтольная гэта пара
Свяціцца ў гаючай вадзе...
А сонца кранаецца сэрца пяра,
Калі ўжо няма надзей.

* * *

Калі не стане ні трывог, ні жалю,
Згарбеюць плечы, вырасце кара,
Я прычашчуся ростанню вакзальнай
З рашучасцю сівога ваяра.

Калі не будзе вечара і ночы
Знякроўленым, зняверанымі радкам
Па берагу нябёсаў буду крочыць
І ластаўку сваю нясці ў руках.

Я рукі-крылы гаварыць прымушу
І вырушу ў сусвет, нібы ў агонь.
Дзе птушкі-сёстры і лясныя душы,
Дзе паранунак і прытулак мой.

* * *

Мае лясы ўпляліся ў неба -
Зара, ўздыхні.
Табе лясы далёка несці,
Прыляж, спачні.

Зара, даруй, напоі неба
Я п'ю з каўша.
Мае лясы не просяць хлеба,
Як і душа.

* * *

Па беламу — трава,
Па чорнаму — няволя.
Галосіць удава
Савою ў чыстым полі.

Па чорнаму — снягі
Пярыну сцеляць душам.
Дзе волаты ляглі,
Там і сірот задушаць.

А пушчы хараство
Спяліць птушыны вырай.
Лятучае яство
Успомніць сны пра крылы.

Успомніць даўніх дзён
Жывую таямніцу:
Хто ў вышыні анёл,
Той на зямлі — крыніца.

А прашчур скажа нам:
«Не будзі яко черві...»
І херувім, як храм,
Асвяціць шлях вячэрні.

Радзіме

Дзе на захад, дзе на захад -
Толькі птушкі, толькі птушкі,
Дзе на волю, дзе на волю —
Вой - Стрыбог,
Я пазнаю па сцяблінках
Тваe нетры, тваe пушчы,
Я пазнаю па слязінках
Ўсіх нябог.

* * *

Пераверцень-трава,
вярні сэрца.
Вярні сэрца —
вярні веру.
Вярні веру —
вярні боль.
Калі прыйдзе ноч,
я знайду цябе на срэбным узмежку,
Пабачу — і аслепну.
Пачую голас жывы — і аглухну.
Памалюся — і знікну.
Назаўсёды застануся
Сярод высокай травы.

Сон

І адчынюцца вароты,
І прапусцяць хеўру соў.
На галіны дрэў самотных
Сядзе сыч — крылаты сон.

І прыйдзе ваяр няўмольны
З дзідай вострай у руцэ.
Ён адчайны, ён бяздомны
Плыў стагоддзі па рацэ.

І павіснуць лахманамі
Рэшткі здрады і маны.
І вада пайдзе кругамі,
Дзе жылі калісьці мы.

* * *

Вечар-вецер,
дзе твае крылы,
дзе тваё сэрца,
дзе мова твая?
Так даўно
я слухаю цішыню
і не чую,
нарадзіўшыся птушкай,
не лётаю...
Вечар-вецер,
дапамажы ўспомніць.

* * *

Калі шчарнее дзень,
Калі аслепне ноч,
Каханне зберажы,
Надзею не суроч.

Чароўнае святло
Кранаецца пяра:
Ты будзеш як агонь,
Я буду як зара.

А потым будзе боль
Гарачы і нямы.
Цябе сусрэць дазволь,
Сярод ахвяр зямных.

Няхай увесь сусвет
Ляціць у бездань сну,
Я разбужу траву,
Навараджу вясну.

* * *

Вечарам-сажай
Люты крумкач
Рукі мне звяжа
Злівай няўдач.

Мукаю звяжа
Радасны дзень.
Дзе мае песні,
Сны мае дзе?

* * *

Так цяжка дадому вяртацца,
балюча і немагчыма.
Вачамі
я неба тваё наталю,
пашлю
калыханку на поўнач табе,
зямле...
Самлею ў тваіх руках,
каханы.

* * *

Крумкачы, крумкачы,
як ад вас уцячы?
Чым завініла я свету?
Сагрэты
лес у мядовых лугах,
а мне
лягла на плечы туга
зрабаванай айчынай.

* * *

Я. Купале

А ў далонях яго — жывая вада,
Напівайцеся, хто яшчэ можа.
А ў сівых гарадах - то нуда, то бяда.
Слепне кожны.
А ў грудзях гарадоў чарадзеі-агні
Душы паляць.
Захіні свайго сына, радзіма, прымі...
Рэжа памяць.

* * *

Крылы сэрцу не па размеру,
Па размеру — шчымлівы боль,
Дзе душа — галавешка,
а цела —
Можа, дрэва, а, можа, дол.

Маё сэрца ўрастае ў глебу —
Мулка спаць, але мякка ўпасць.
Прылягло на галіны неба,
Як яго з баразны дастаць?

Я гукаю, а гукі, як рукі
Прытуляюцца да грудзей,
Дзе калісці ахвярныя руны
Прарасталі, жывілі людзей.

У краіне, дзе любяць вешаць
Аняменне — практычнасці знак...
Неба птушкам. Мне — галавешка,
Дужа зручна ганяць сабак.

* * *

Хто хоча мяне зразумець,
знямець
спрабуйце навучыцца.

Чуеце: я — крыніца,
ніцая, срэбная, нічыя,
адвечная, недарэчная я.
Поўня сястра мая.

* * *

Сіні дзень:
верасовы,
бярозавы,
сакавіты.
Трымбіты,
бомы вакол.
Племя ваўкоў
чакае мяне
на ўзмежку.
Кужаль свой дараблю,
абагрэю зямлю,
Пабягу
ў лес знаёмы
бярозавай сцежкай…

* * *

Дзіўны бярозавы дзень
Па-дзіцячаму нечаканы.
Ён сэрца маё не ўкрадзе,
Яму не скажу — каханы.

Але ў гэтым жорсткім свеце
Так мала сапраўдных слоў.
Вы чуеце: гэта — вецер.
Вы бачыце: гэта — сон.

* * *

Пра сонца напішаш золатам,
Прачытаю я ночкаю.
Быў ты ясенем-волатам,
Я — вярбінай-сіроткаю.

Быў ты лівнем і травамі,
Я — ліпнёвай галінаю.
Разам мы валадарылі,
Разам мы і загінулі.

* * *

Вачэй не пазнаю і крыл.
Вочы твае выпіў крык,
А крылы ўпадобіў крук,
Ён кранаўся шурпатых рук.

Ён сядаў на плячо тваё,
Высякаў на плячы таўро.
Ты падняцца не меў ужо сіл
І застацца мяне прасіў.

Ты ляжаў сярод белых прасцін
Процi ночы — адчаю сын.
Ты маўчаў і маўчала я,
Некаханая, нечыя.

А зямля гаравала грымотай
І шаптала замовы ўпотай
На крылы і на прырэчанасць
Каханне вымольваць у вечнасці.

* * *

І прыляціць крумкач няўмольны,
Стамлённы, з восенню ў вачах.
Мы з ім падзелім ноч пароўну
Адчаем вострага мяча.

Мы з ім падзелім лёс і ложак,
Кавалак хлеба і тугу,
І пагаворым, нават можа,
І заспяваем на бягу.

І кожны з нас спячэ атруту
На зачарованых вуглях.
І будзе ноч адной пакутай
Туляцца па вуглах.

* * *

За воляю сорак год
Мы, бяздомныя, крочылі.
Гінуць сарокі-саракавіны.
Вочы твае, як ночы,
Вусны твае — руіны.

За берагам — не снягі,
Сцягі гарацць спарахнелыя,
Быў ты мне дарагі
Вострымі стрэламі.

Слаў ты мне гарады
Ды з палянамі яснымі,
Я ж любіла сады
Птушкаю-ястрабам.

Я ж любіла жыццё,
Цішыню бузіновую.
Ты не сукню дарыў - асцё
І віно бізуновае.

* * *

Сон-трава кранае сэрца,
Сон мой дзе?
Сэрца ў сэрцы адзавецца -
Быць бядзе.

Сон-трава сагрэе душы
Дзіўным днём.
Тоне сіні лёд у мушлях —
Хутка дно.

Душы-мушлі — шлях адважных.
Лес шуміць.
Казку сон-трава раскажа
І згарыць.

Сем крокаў

Жыццё на сямі вятрах
Настоена, быццам песня.
Нібы пуцяводны шлях,
Шалёная смага песціць.

Жыццё — гэта сем дарог
І толькі адна — нябёсы.
Жыццё — гэта сем дароў
І звонкая сіняя восень.

Жыццё — гэта проста быць
І бачыць лясы і пожні.
Сем крокаў — слова «любіць»
І кожны той крок апошні.

Каня

трыпціх

I
Дзе каня кінула пяро —
Надзея на зару.
Дзе на траву пяро лягло —
Суніцы сабяру.

Я зноў радзіму буду сніць
І каню ўспамінаць,
На сінім беразе снягоў
З нялюбым векаваць.

2
Каня, дзіўная птушка,
зноў і зноў вяшчуе каханне:
«Піць, піць, піць...»
Ты не бачыш хіба,
што рака мая чорная?
Начавала тут поўня нядоўга,
а даўгі раздавала да ранку.
Потым села ў зорны човен
і паплыла
куды вочы глядзяць,
куды сэрца вядзе...
А рака загарэлася,
і згарэла жывая вада.
Дзіўная каня,
навошта табе гэты боль?

3

Каня, пакінь мяне,
Не праклінай,
Падымуся з калень —
Будзе май.
Каня, калецтва маё
Не цяжар,
Проста кроў да краёў
Ад крыжа.
Каня, крычы не крычы —
Сон на вадзе...
Боль мой, маўчы,
Май мой ідзе.

* * *

Маё каханне — у барах,
Яму расой гарэць.
Ды вораг мой — адвечны жах
Смалою на карэ.

Маё каханне — у траве,
У квецені садоў,
Ды вораг-жах зіму заве
У нетры гарадоў.

Маё каханне — гэта ты,
Самотны хлопчык-май.
Ды вораг-жах мне шле лісты
З таўром: цябе няма.

* * *

Бура, бура, я — жывая,
Мой адчай — трава-кавыль.
Тая рана нажавая
Дадала радкоў і сіл.

Навучыла быць прыгожай
І глядзець за далягляд.
У маёй далоні можа
Зацвісці бацькоўскі сад.

Бараніся, бура, сэрца,
Будзь ціхмянай да пары.
Пакахаць — амаль што ўмерці.
Бура, бура, гавары!..

* * *

Ты мяне на руках панясеш,
Як насення вясенні смех,
Як краплiну з роднай страхі,
Дотык рэха да вуснаў ракі.

Ты не грэх мой, не насланнё,
Ты няўтольнае сёння маё,
І няўмольнага ўчора мніх,
І раздольнага заўтра слых.

Служу я табе, служу,
Кружуся з табою, кружу...
Шапчу шалёнаму ветру,
Што вечарам стану светам.

А ноччу амаль што знікну.
Світанак пачнецца крыкам —
Крылатае немаўляці
Народзіцца сёння ў маці.

Гавары са мной, гавары,
Сівагрывы вецер лясны,
Сівачолы вечар-крумкач,
Ты мяне гайдай на плячах.

Выпівай, як віно, спакой,
І ляці басанож за мной.
Ты сукенкі бярозавы гай
З цішыні навакольнай зрывай.

З твайго неба пусціцца дождж,
З майго цела народзіцца ноч.
І будуць блакітныя вочы
Ў расы верасовай, прарочай.

* * *

Я спяю табе пра мора
І вялікіх рыб.
Ты даверлівы і ўмееш
Шчыра гаварыць.

Я спяю табе пра скалы
І лясны ручай.
Толькі гэтага так мала
Для тваіх вачэй.

Я спяю табе, напэўна,
Тое, што заўжды...
Лепш не слухай мае песні,
Пі мае мяды.

Лета...

Вербалозы, не плачце, я калісці
яшчэ вярнуся.
Маім правым крылом будзе бусел,
Маім левым крылом — подых сонца.
Верце. Лета будзе бясконцым.

* * *

Спявай, вярбіна, спявай,
Вер у сваё яство!
Гэта — свавольны май,
Гэта — зямлі хараство.

Танцуй, вярбіна, танцуй!
Не думай, што будзе потым,
Нават, калі сумёты,
Адчуй крылы, адчуй!

Плач, вярбіна, плач,
Вер, вярбіна, вер,
Пакуль не прыйшоў палач
Аднойчы вечарам.

* * *

Я была зарою,
Я была травой,
Ветрам на сваволі,
Хуткаю ракой.

Я цябе гайдала
На сваіх руках,
Я цябе жадала
Сёння і ў вяках.

А калі ўжо вечар
Клаўся на крыло,
Сцішалася вербай
Недзе за сялом.

* * *

Заліўныя лугі — каляровыя:
Жоўтыя, белыя, залацістыя.
Злева дрэвы стаяць — волаты,
Справа рэкі цякуць чыстыя.

Галасы звіняць салаўіныя,
І стракозы шукаюць зацішак...
Днём мы ў гэтых лугах загінулі
І нарадзіліся зацемна.

* * *

Мы вярталіся дадому,
Дзе стагоддзі, нібы дзень,
Дзе зялёны погляд долі
Адбіваецца ў вадзе.

Мы вярталіся да лесу,
Да пагоркаў і травы,
Дзе аддана правяць мессу
Пчолы, шэршні, салаўі.

Я табе чытала кніжку
Без старонак і лістоў,
Плёў павук за ніткай нітку,
Ткаў пасаг гадоў на сто.

Мы вярталіся да раю,
Ты — Адам, а Ева — я.
Бог шчаслівых не карае
Пакуль верыць ім зямля.

* * *

Прачынаемся разам з птушкамі.
Засталося ў сумётах гора.
Сёння мы павандруем пушчамі,
Заўтра мы пацалуем мора.

За адбіткам святаў прастольных
Паляцім шчаслівыя дзеці.
У нябёсаў радасці столькі,
Што ведае толькі вецер.

Прачынаемся разам з птушкамі,
Выпускаем з далоняў сонца...
— Пушчы, пушчы, дзе нашы душы?
— У вербах і вешчых соснах.

* * *

Спіце. Я буду ваш сон шанаваць.
Спіце дрэвы, спіце дарогі.
І паляцяць дзьмухаўцы вандраваць,
І зара будзе доўгай-доўгай.

І паляцяць дзьмухаўцы, нібы лёс,
Над дарогай з гарачым пылам...
Падымуся з калень, дзе жыццё
быццам лёх,
Дзіва там, дзе адчую крылы.

* * *

І зара не зара, і гара не гара,
Калі крэпка рука трымае.
Як на радасць мне лёс дараваў ваяра,
Як на смутак яго прыймаю.

І лясы не лясы, і раса не раса,
Калі блізка вусны і вочы.
Як на шчасце — трава,
як на шчасце - краса,
А я гора сабе прарочу.

Так прыгожа з гары паляцець да зары.
Закахаўся ў зару буйны вецер.
Маё сэрца, гары, мой ваяр, гавары,
Пакуль вечар.

Дом

Дрэвы зверху растуць,
карані знепрытомнілі вечнасць,
Астудзі цішыню, астудзі.
Грудзі дыхаюць вольна
і неба ў зялёнай квецені.
Нас ніхто не ў праве судзіць.
Дрэвы з неба растуць
і будуюць надзейныя шаты,
Каб ніхто не знайшоў,
не парушыў сунічны наш дол.
Птушкі сонца нясуць —
пазалочаны венчык да хаты.
І асвяціць яго
самы чысты ранішні дошч.

* * *

«Хлябы свае пускай па вадзе..,і
З «Новага Запавету»

Калі зара кранаецца улоння
І шэпча ціха і пяшчотна: «Паляцім...» -
Я прачынаюся, я ўся ў яе палоне,
Бо я — трава, мой запавет — расці.

Калі вятрыска мне цалуе вочы
І песціць рукі, плечы, валасы, —
Я адраджэння пасля шалёнай ночы,
Яго любоў — сакрэт маёй красы.

Калі зіма агнём крывавіць неба,
Мне ў гэты час нічога не кажы,
Бо я зямля, і чарназём, і глеба,
Я заўтра — хлеб, а, значыць,
будзем жыць.

* * *

Я ўпаду на траву
Салаўінаю ўсмешкаю сонца,
Крумкачовым ўспамінам,
Адвечнаю песняй расы.

Я ўпаду на траву -
Так імгненне дагоніць бясконцасць.
Гэта значыць жыву,
Гэта значыць насенню расці.

* * *

Сёння дажджы павяртаюцца ў новае кола,
Ніцыя вербы паверылі, што ацалелі.
Слухай, мой любы, больш не кажы «ніколі»,
Лепш цалуй мне калені.

Жывая вада асвяціла нам сны і грудзі,
Хмаркі ляцяць, нібы вешчыя вольныя
птушкі…
Лепшага дня на зямлі ўжо не будзе, —
Ён заблукаў у пушчах.

* * *

Жывая вада наталіла мае далоні:
Пі, пяшчотны, ты перайшоў пустэчу.
Цені. Знепрытомнілі дрэвы пад вечар.
Гэта вецер крануўся майго улоння.

* * *

Люляйце мяне на руках,
Я сёння каханка Ваша.
Наш дом на сямі вятрах —
Прытулак сірот адважных,
Прытулак сівых нябог
І валацуг стамлённых.

І ведае толькі Бог
Пра гэты палон зялёны.
Люляйце мяне да зары,
А з першым праменем сонца,
Я ўжо не змагу гаварыць
І знікну прымарай у соснах.

* * *

Я сыйду пакрысе
Журавінавай згадкаю лета
У асеннюю сінь,
У шаленства гарачых замоў.

Я сыйду па расе
У абдымкі нябёс і сусвету…
Будзе цёпла зімой.
Веру я,
Будзе цёпла зімой.

Зімовае

Суцішся, неба, спачынь,
Чырвонае ты ад болю.
Нялёгка душы лячыць
І перапісваць долі.

І падае з рук пяро
У снег. Замяло падлогу-
Зноў ледзяной карой
Пакрыецца сэрца надоўга.

Дарогі мае, як на грэх,
Сышліся наўсцяж бінтамі.
Мой любы, рукі сагрэць
Цяжка на развітанне.

Крывавае неба баліць,
Пульсуе, сцякае свечкай…
Да нашай халоднай зямлі
Дакранаецца вечнасць.

* * *

Мне столькі гадоў, сколькі небу
І гэтай гаротнай зямлі.
Свой лёс буду годна несці,
А палячу калі —
Кветкаю вырасту ў жыце
І зацьвіту ільном,
Шчырым і шчодрым Жыгаем
Крануся вершаў і сноў.

* * *

Гарэў касцёл так горача, так ярка.
Яго душу нябёсы берaглі.
Бялела поўня свечкай-недагаркам,
Чарнела сонца скрухаю зямлі.

Гарэў касцёл, а людзі галасілі,
Клялі свае смяротныя грахі.
Шалёны вецер над крыжом знясілеў
І прытуліўся тварам да страхі.

Гарэў касцёл, а вусны анямелі.
Малюся моўчкі: «Госпадзі, пачуй
Знямоглых нас, мы аццаніць не ўмелі
Тваю любоў. Даруй жа нам, даруй…»

Гарэў касцёл. Гарыць ён нават сёння.
Сівеюць скроні і ляціць жыццё…
Не пагарэльцы мы, а навасёлы.
Нам будаваць у сэрцы свой касцёл.

* * *

Першы крок — толькі крык,
Першы крок — вешчы крук.
Гэта сусвет гарыць.
Гэта гавораць рукі.

Дык паляцім да зары,
Потым — да сёмага неба.
Будзем з табой гаварыць
На мове птушынай, срэбнай.

Навучымся разумець
Адвечныя песні зорак.
Каханы мой, струмяней!
Зоры, мой любы, зоры!

* * *

Дождж праліецца - будзе светла душам
На чарадзейных сініх астравах.
Маё бяссонне свой танок закружыць -
І на каменні вырасце трава.

Мая пяшчота зёлкамі шапоча,
У золаце пшаніцы далягляд...
Ратую Вас. Я сёння Ваша прошча.
Я тое, што не верніцца назад.

* * *

Каменны мой, табе я толькі снюся.
Душу сваю збалелую шукаю.
То песні дзіўныя спяваю,
То Богу горача малюся.

Мой ледзяны, твой сон быў вешчы:
Ірдзела я зарой да ранку.
Была расою і падранкам,
Пакуль ты гладзіў мае плечы.

Няўмольны мой, за шал душы і цела,
За сонечны ліпнёвы далягляд
Укленчу ў залатых палях
Сівой мяцелі.

* * *

Мой дзед — каваль. Ён сёння
мне прысніўся,
А я ў яго сядзела на каленях.
І недзе вецер люта ў шыбку біўся,
І недзе горад прарастаў каменны.

А я сядзела ў дзеда на каленях, —
Было так лёгка і зусім не страшна.
Утульна печ-ахоўніца бялела,
І на стале ляжалі яйкі-крашанкі.

І цікаў на сцяне гадзіннік,
Адлічваў нам стагоддзі і хвіліны…
Мой дзед — каваль. Ён малады і с ільны
Вартуе сон дзіцячы светла-сіні.

* * *

Праз вокны дрэвы прарасталі,
Спяшаліся да сініх сноў.
І снег на сцежцы хутка таяў,
І пахала ў горадзе вясной.

Анёлак мой ружовакрылы
Хадзіць вучыўся, як дзіця,
І веі цёплы вецер снілі
Да шалу і да забыцця.

І падымаўся цёплай пасхай
Над домам нашым новы дзень...
А я тваёй чакала ласкі
Усё радзей.

Радзіма

Буду сніць палі і пушчы,
Сон лясоў, напэўна, вешчы.
Я травою невідушчай
Вышывала слова «вечнасць».

Вышывала-варажыла, —
Залацела буйна жыта.
Дзе душа спяліла крыла,
Я складала вершы-міты.

Так няўмольна і балюча
Ллецца дождж, сівеюць скроні...
Ад зары маёй гаючай
Кветка-восень на далоні.

* * *

Птушкі-душы, ляціце на поўдзень,
Паўдарогі ўжо за спіной.
За гарамі, як рана, поле,
Там каханы застаўся мой.

Апякае далоні і косы
Пыл сцяжын залатых, дарог...
У лясах запаветных — росы
Вырастаюць дзіва-зарой.

Толькі ўчора — ржаное лета.
Вы ж ляціце далей і далей
У абдымкі мудрых сусветаў.
Я спачну на вашым крыле.

* * *

Гара, а ў гары — пячора,
Там пчолы жывуць залатыя,
Там ты і я, нібы ўчора,
Шчаслівыя і маладыя.

Гара, а ў гары — пячора,
Чорная, як смала.
Ластаўка там жыла ўчора,
Сёння ляцець не змагала.

Шчасце-гара, гара-гора, —
Вечнасць гартуе радкі.
Сёння, і заўтра, і ўчора
Хвалі адной ракі.

* * *

Наш дом — толькі ветру шум,
Наш дом — папяровая цацка.
Дзьмухну на яго знянацку —
І вось я ўжо ў небе кружу.

Шукаю свой дом. Туманы
Кранаюцца босых ног.
Начамі траву-быльнёг
Тулю да дзвярэй-падманаў.

Мне вокны ў лясных краях
Мільгнуць хітравата вокам:
І змоўкне ў вецці сарока,
І знікну, як прывід, я.

* * *

Спявай, пустэча!
Дзверы ў вечнасць
Адчыніш ты перада мной,
Знямоглай, кволай, недарэчнай,
Але жывой.

Спявай, пустэча!
Мая доля
Калені збіла да крыві.
Цяпер табе дарую волю:
Чаруй, жыві.

Спявай, пустэча!
Люты вецер
Маю пакуту нагбам піў.
Вяртаюся, бо я прырэчана,
Да родных ніў.

* * *

Ёсць, кажуць, рака над ракою,
А побач — вярбіна-вечнасць.
Крануся ракі рукою,
А вечнасці — цёплым ветрам.

Рака над ракою — вокны
І ў кожным — агеньчык светлы.
А мне, такой сінявокай,
Пра гэта сьпявалі вербы.

Пашыю з дажджу кашулю
І ў рэчку ступлю адважна,
Бо падае матуля
Мне паясок сярмяжны.

* * *

Вялікая рака. Яна жыве ўспамінам
Пра волю срэбных крыл, паходні, ваяроў.
Мінулыя вякі штандарамі ўсцялілі
Яе сівое дно, загаварылі кроў.

Свяшчэнная рака. Гаротніца-жывіца,
Спяліла берагі, прыймала ўсіх сірот.
Яна заве й мяне да берагіняў ніцых.
Я бачыла Анёла там. Ён плакаў пад гарой.

* * *

Лясныя берагі,
вы — карані сусвету,
Я адчуваю вас
і сэрцам, і зарой.

Лясныя берагі,
вы — пуцяводны ветах,
Мой пракавечны боль
і залаты спакой.

* * *

Адным няўлоўным сном-крылом
Спатоліць ноч тваё маўчанне,
І перапоўніць сумны дом
Шалёны вецер на світанні.

Сплывуць да рэчкі груганы
Вачэй-сірот, агней няўтольных.
Не будзе праўды і маны
У бездані сляпой далоні.

Прачнецца воўк сівой тугі,
Мой кроўны брат зямны і жорсткі.
Ён разрывае ланцугі,
Як спарахнелыя вяроўкі.

Той воўк не ведае жалю.
І воля, як закон адзіны,
Яго паставіць на зямлю,
На ўсе сумненні, люці, кпіны.

Ён разарве маркот асцё,
І грэх, і жах, і памяць болю,
Калі нясцерпнае жыццё
За шыю сціснe памяць волі.

Я пабягу ў знаёмы лес,
Сустрэну сонца зорнай песняй...
Душа падымецца з калень,
І засмяецца, і ўваскрэсне.

* * *

Дзяўчынка, вяшчунка — душа,
Дай моцы мне волі напіцца
З сярмягі нябеснай — каўша,
З драўлянага сонца свяціцца.

Дзяўчынка, халодна табе,
На вейках дрыжаць ільдзінкі
І ўсё-ткі аднойчы праб'еш
Завею зялёнай травінкай.

І крыгі растануць тады.
Мудрэйшая за стагоддзе,
Дзяўчына збярэ мяды
І немаўляці народзіць.

* * *

Прываражыў мяне зарою
І кветкамі ў снягу.
Таго, каму была сястрою
У сэрцы зберагу.

Таму, каму была надзеяй, —
На дзень падобны век,
На шыю ладанку надзену,
Не падыму павек.

Таму, каму была як сонца,
А болей не магу,
Я падару радкі і сосны
І след на берагу.

* * *

Калі збіраешся ў дарогу,
Цябе за рукі не ўтрымаеш,
Бо ты маліўся толькі Богу,
А я нябёсам і падманам.

На падваконні свечка цвеліць,
Як сонца ў адмысловай раме,
І плечы мне сціскае вечар,
Цябе ж укрые рызай ранак.

Расой я не паспею ўмыцца,
Бо за табой ісці баюся,
І будзе зоркаю іскрыцца
Твой погляд, як самотны бусел.

Калі ты рушыш у дарогу,
Я буду сумнай і прыгожай.
Дзе з рога шчасця так нямнога,
Маю пяшчоту ўспомніш можа.

* * *

Дзе толькі сосны,
Сніцца мне мора,
Сонечны ветразь,
Свет непакорны.

Дзе наша доля
Лапці знасіла,
Чорныя вочы
Ласкі прасілі.

Каляровая варажба

Зялёнае з белым — мара мая,
Няўлоўная, як змяя.
Гэты колер прыдумала я:
Мара, маркота, зямля...
Зялёныя вочы ў травы.
Вы — крылы савы,
Вы — голас дажджу.
Мяжой пахажу... Варажу...
Якія вочы ў мяжы? —
Травяныя крыжы.
Жоўтыя капяжы.
Жыта дрыжыць, як жыццё,
Калі ў неба ляціць асцё.
Над прорваю спеў салаўя,
Калі ў неба ляціць зямля...

Варажу... Час бяжыць...
Вы жывіце,
А я — толькі мара.

* * *

Каляным імгненнем, гартоўным,
Калі балюча каленям,
Ты, можа, прыйдзеш, мой родны,
Калі мы разам знямеем.

Калі маліцца не ў змозе,
Калі згарбеюць завеі,
Ты рукі мае ў свае возьмеш
І пацалуеш веі.

Укленчым цару лясному,
Укленчым гаючым вокнам,
Дзе па дарозе з дому
Свеціцца толькі восень.

Дзе па дарозе з лета
Коцяцца сны і крозы...
Можа прыйдзеш, мой лепшы,
Толькі ўжо будзе позна.

* * *

Жыві, мая птушка, жыві,
Жывіся гаючай слязой.
Дзе сёння агонь ў крыві,
Заўтра — зялёны спакой.

Заўтра — зялёны сусвет
Ад бездані напрасткі.
І недзе сумленны сусед
Стаміцца лічыць радкі.

Дзе толькі жыццё да зары —
Гарыць салаўіная ноч...
Нам будзе стагоддзі дарыць
Хмяльное лясное віно.

* * *

Валадар майго сэрца адзіны,
На каленях малю:
Давай паслухаем вецер
І залатую зямлю.

Як спявае крыніца, чуеш?
Травы, травы пяюць.
Мёдам, мёдам частуюць
Душы ў раю.

Слухай: саве не спіцца.
Чуеш сястру маю?
Я ў савы папрасіла
Ноч у гаю.

Тут і зямля, і неба,
Як пацалунак твой,
Шчодрага лесу нетры
Наталяюць расой.

Валадар майго сэрца адзіны,
На каленях малю:
Давай паслухаем вецер
І залатую зямлю.

* * *

Гарачыя вусны ў халоднай зары.
Ты, папараць-кветка, са мной гавары.
Забудземся сёння пра дзень і пра ноч,
Маю апантанасць, прашу, не суроч.

Я ўмыюся небам, гаючай расой,
І будуць вятры мілавацца красой.
Ускінула рукі — зламіла жыццё,
Пашкодзіла крылы — ізноў небыццё.

Учора прымара, а сёння — трава.
Я сёння каханка, мой любы, твая.
Глядзі: маладзеюць шалёныя ночы,
Галоўнае — з вешчай сцяжыны не збочыць.

Ранак

У руках тваіх — зара,
Росы.
Па сцяжыне ты ідзеш
Босы.
На плячах нясеш мяды,
Казку.
А ў вачах гарыць мая
Ласка.

* * *

Птушка-ноч прыляціць з-за лясоў,
З-за самотных змарнелых вёсак,
Нас укрые сваім крысом,
А ў вачах яе будзе восень.

І ў вачах яе будзе боль
Развітальны, гаючы, вечны.
Яна бачыла ўсіх нябог,
Яна ведала шчасця веліч.

Ты за плечы возьмеш мяне,
Пацалуеш пяшчотна, рашуча.
Знікне сум, знікне боль. Ноч міне.
І згарыць за воўчаю кручай.

* * *

Я цябе не кляла, а клікала,
Мой далёкі, гаротны мой.
Далягляд абрываўся ліўнямі
І звінеў калёнай стралой.

Адзічэлы месяц над безданню
Падстаўляў плячо для стралы,
Ратаваў сястру сваю бедную
Ад вялікіх спакус і малых.

Далягляд абрываўся песняю -
Птушкай сумнай, адчайнай, жывой...
Мы яе ў руках доўга песцілі
І паілі ўласнай крывёй.

Зязюля

«Калі шэра зязюля, -
ляці ў сіні бор...»
З народнай песні

— Зязюлька, зязюленька,
хутка зіма,
ці пашыла футрачка?
— Не ўмею сама.
— А дзе ж твае дзетачкі?
— Недзе пайшлі,
паплылі, паехалі,
па-ля-це-лі.
— А калі мяцеліца,
што рабіць?
— Мне лётаць хацелася
болей, чым жыць.
— А калі марозамі
да душы?
— Усё лепш, чым слёзамі
свет смяшыць.
— Пёркі твае шэрыя,
белая душа,
збіраешся ў вырай?
— Раю няма.
— Дык ляці, сястрыца,
за сіні бор,
і мяне самотную
пазаві з сабой.

* * *

Ад вольнага дольняга ветру,
Дзіцячай стракатай кніжкі,
Ад кані - няўтольнай крыніцы
Аднойчы з'явілася я.

А рукі - не рукі, а крылы.
А плечы — не плечы - узлескі.
А вочы — не вочы, а мора.
А доля — не доля — агмень.

* * *

Калісці я ўмела лётаць.
Употай бегла да дуба старога.
Ласі рагатыя бачылі,
Снягі каляровыя чулі.
І мы разам з дубам адчайна
Малілі птушку-зямлю,
Любоўю сваёй замаўлялі,
Гарачаю смагай, жыццём
Цела нам даць для палёту.
А потым мы з дубам ляцелі
І цешыліся цішынёй,
Небам, сукенкай вясельнай,
І залатым агнём...
Толькі анёлы бачылі.
Толькі анёлы чулі...

* * *

Калі цар лясны
Свае мне даверыў сны,
А чорны разумны грак
Пяро, як нацельны знак,
Я думала доля — ляцець
З маёй травяной пасцелі,
Ліўнем ці рэхам сцяпным,
Нястрымнай птушкай вясны.
І я ірванулася ў неба
Галінкаю кожнаю, нервам,
Але карані абхапілі
Зямлю, як магутныя крылы.
Так і плывем у прасторы:
Птушкі, і рэкі, і горы,
Боль, як тумана адценне.
Неба — душа, зямля — цела.

* * *

Пушчы ляцяць у вырай,
Выракаюцца глебы,
Карані, нібы крылы,
Закрывавілі неба.

Пушчы ляцяць, як птушкі
У блакітным сусвеце,
Душы дрэў не затушыць
Нават сіберны вецер.

Ім палаць, як ніколі.
Зорыць памяццю квецень.
І гарачыя кроны
Уплятаецца ў вечнасць.

* * *

Хто крылы падарыў дажджу?
Далёкі гром, ці шчырая малітва,
Ці мы з табой, прамоклыя да ніткі,
Ці ноч, якая перайшла мяжу.

Хто крылы ладзіў для мяне?
Бяссонню берагам сцяліцца,
Яму ніяк не наталіцца,
І небу ў вокны птушкай біцца,
А мне ў вачах тваіх нямець.

* * *

Мяне не пытай пра крылы,
Згасае мой век прарочы.
Снягамі душу накрылі,
Але пакінулі вочы.

Прыслухайся: лес галосіць.
Ён волі просіць у глебы.
Халоднаю гэтай восенню
Яго пакахала неба.

Доля

З рога - журботы многа.
Абрусам ляжа дарога.
Рукой памахаюць сябры мне
Такія яшчэ маладыя.

І маці хустачку здыме,
Угору рукі падыме.
Пасля пажадае шчасця,
Каб мне ў людзях не прапасці.

З рога — пяшчоты многа.
Цалавала ногі дарога,
Залаціла крылы дажджом,
Жоўты ветах рэзаў неба нажом.

«Табе кавалачак і мне акраечак.
Ад раю — толькі ночка.
Народзіш сабе сыночка.
Будзе галубочак, валасы — ляночак».

З рога — трывогі многа.
Спяшалася да царквы,
А чула ўсё шум лясны:
Апантаны, пралескавы
верасовымі песнямі.
Абрусам ляжа дарога
З пяшчоты, журботы, трывогі...

* * *

Верас цвіце ля вады,
Навальніца хавае сляды,
Дымам плыве зара,
Побач з зарою — я.

Звінець не ўмела, гарэла ўпотай,
Лета маё — летуценне.
Першы каханы самотны,
Другі мой каханы — вецер.

Дымам, дымам плыве зара.
Рукі сціскаю я:
«Зара, пачакай старэць,
Нам гарэць, нам зямельку грэць».

Ды халодная зара
Не кранаецца пяра.
Пачакай, мая зара,
Мы расой не ўмыліся...

* * *

А мяцеліца доляй сцеліцца,
А мяцеліца варожа:
Хто з нас панскага роду,
Хто трава пры дарозе?

Не хвалюйся, мяцеліца,
Цешся з ветрам-ільном,
Ты пануй ночку цэлую
І цалуй яго днём.

Я ж знямею травою
І пад снегам засну,
Каб з вадой залатою
Уварвацца ў вясну.

* * *

Плашч надзела на цела ноч.
Ноч — не мышка-палёўка.
Дыхаецца не лёгка:
Ноч — чорны крумкач.

Крычы не крычы — чужая ты.
Перабег, пералёт — з маста пад лёд.
Ледзяная вада — да вокан бяда.

Да світання — нябесная манна.
Мана! Чужынка я.
Была, застануся...
Дзе белы мой бусел?
Сялом паляцеў
Да белай пасцелі,
Да чорнай купелі...

«Люлі-люлі» спявала,
Сынка спавівала.
А цяпер пералёт —
З маста пад лёд.

Да світанку — чужая каханка.
Крычу, рагачу...
Чуе мяне толькі ноч
Крумкачовая, злая, сірочая.

* * *

«Де пісня твоя, зозуле?
Ти ж знаєш, що слива цвіте
Вже в першому місяці року!»
Мацуе Басё

Лес няўтольны — лёс птушыны,
Хто спяваць цябе вучыў?
Дзе гарбеюць успаміны,
Толькі сойка закрычыць.

Толькі кнігаўка заплача,
Сыч прысніць лясны матыў
І маркоту перайначыць
Летуценнем залатым.

Тут вясной сваволяць росы,
Дня каўтаючы бялок,
І кудлаціць мае косы
Ветра вабнае крыло.

Можа тут шчаслівай стану,
Паслухмянай і зямной,
І прамые ветах рану
Ранішняй вадой жывой.

У нябыце я пакіну
Успаміны пра бяду...
Лес няўтольны — лёс птушыны,
Мяне мёдам нагадуй.

* * *

Воды падымуцца —
будзе бяссонне вясне.
Я паяском абвязала нябесным цябе,
Каб не ўтапыўся,
за хмарку ўхапіўся.
Адчуваеш? — Цягну.
Гнуся,
гайдаюся,
гіну...
Цябе я ў бядзе не пакіну.

* * *

«И осенью хочется жить этой бабочке:
пьёт торопливо с хризантемы росу».

М.Басё

У маіх далонях восень
Ладзіць свой дзівосны танец,
Вецер сіні рвецца ў вочы,
І буслы ў павеках тануць.

Тоне, тоне свята гукаў,
І ружовая раса
На світанку — толькі мука,
Развітальная краса.

Позна, позна ткаць пярынку,
Прорва шчэрыцца даўно.
Ты падорыш мне хусцінку
І прагорклае віно.

Дзе на кожны ўздых па пёрку -
Там апошні лета спеў.
Верш на тонкую паперку
Не спяшаецца цяпер.

А пасля — цярпець марозы
І цяжарыць цішынёй...
У блакітных вокнах — слёзы.
У блакіце — позірк твой.

* * *

Гэты урок —
зарок ад пытанняў.
Безліч вакол дарог,
безліч світанняў.

Адзіны мой, лічаны —
свечка грамнічная на акне.
Вусны твае сунічныя,
веі — сны.

Душамі хмары парушаны.
Там наш дом.
Дзе загарацца сцены —
на чаўне паплывём.

Вёсны — ветразя росы
нагбам піць...
Лёс ты мой паднябесны,
няўтольны блакіт.

* * *

Прыдзецца жыць, каб адзіная ночка
Смагай была і бялявым сыночкам.
Прыдзецца жыць, каб сівая бяда
Недзе далёка ад ганку лягла.

Лесам зязюлька кувала-кувала...
Ёй гэтай ночкі-заранычкі мала.
Трэба было ёй шчаслівай радзіцца,
А не гаротнай маёй сятрыцай.

* * *

Калі буду смагаю —
Белым полем лягу я.
Калі буду ночкаю —
Стану свечкай моўчкі я.

Прасцялю настольнікі
На руіны-споміны.
Дзе жыццё сірочае
І радкі прарочыя.

* * *

Чужына мая, чарніца,
Ці жывая я, ці сніцца?
На чырвоную траву
Я схіляю галаву.

Чужына, маё бяссонне,
Я імя свайго не ўспомню, —
Адчуваю толькі неба
І глыток гаючай глебы.

Чужына, маё збавенне,
Ты мае закрыеш веі.
І завее снег спакусы
Мае косы, мае вусны.

* * *

Не!
Мяне не кляні.
Я — клікуша з падзёртым бокам.
Вокам вакол павяду —
І збудзецца ўсё,
І змоўкне.
Не кляні клікушу,
Малю,
У мяне не кідай каменнем.
У далоні — жменька насення
Адзіная на зямлю.

* * *

За шчасце плаціць цішынёй.
Зноў крывавіць спякотнае лета.
Вырушаеш не ў поле са мной —
У далоні сусвета.

Вырушаеш у нетры трывог
І ў залётныя сосны.
Не пытаецца пра залог
Золак жоўтага сонца.

Вып'еш ты гэты боль, як віно.
Песня нішчыць вяртанне.
Я цябе папрашу пра адно:
Памаўчым пра каханне.

Калінавы Мост

1
Калінавы мост паміж намі.
Калі ты паедзеш канём —
Знямею адна пад вятрамі,
Знякроўлю журботным быллём.

Былое прымроіцца блізкім
І чорнае белым тады,
Калі над сірочай калыскай
Буслом пракурлычаш ты.

Цярпець цішыню так знаёма.
Вядома, завея змяце
Пярынку-цябе, знядоліць,
Зняволіць, чужую, мяне.

Калінавы мост паміж намі.
Далёкія сны — берагі.
Бягу да цябе радкамі.
Лаўлю на вадзе кругі.

Першы круг — чорны крук,
Круг другі - дарагі,
Трэці — лёгка ўмерці,
Чацвёрты — гарачыя вёрсты...
Варожаць кругі,
А навокал... снягі.

* * *
Варажыла і сэрца згубіла,
Лашчылася шчанюком.
Ночы той вераб'інай
Біцца і млець пад рукой.
Ці дажывем да світанку?
Цень на шурпатай далоні
Будзе дрыжаць, як каханка
Недзе ў зямлі Вавілону.
Лону зарою свяціцца,
Цешыць спакусаю сон твой.
Ці дажывем да світанку? —
Свечка гарыць, як сонца.

Каляровыя вершы

трыпціх

Белы

Пад снегам рукі твае...
Вее, мяце завіруха,
хавае гарачыя рукі,
як рэкі, глыбей і глыбей.
К табе
бягу па беламу.
Ламаю сівую траву,
то выю ваўком,
то пяю...
Палаюць ночы і дні,
Знікаюць сярод зімы.

Зялёны

Зямное зямлі.
Млее зялёны ліст летам.
Там, дзе няма мрозаў —
ветразь
і ліст зялёны.
Залётны,
ляціць
да долу,
да дому,
ці, можа, у рукі твае.

Чырвоны

На чым прыплывеш?
Ведаеш,
яшчэ малой
я марыла
пра ветразь чырвоны.
Вядома,
марыла й пра капітана...
Танулі мары,
радком працягвалі жыць.
Дрыжыць
мара — жылка чырвоная
у руцэ:
днямі, начамі чакаю яшчэ.
Тчэ парка смагу маю.
Ма-лю-ся...

* * *

А.Д.

Лячу к табе цераз вякі,
Цераз дарогі і турботы.
Кранешся ты маёй рукі
Крылом лясным, начным сумётам.

Кранешся ты маёй душы
Чароўным снегам, дзіва-ветрам...
На полі нашым - спарышы
І сіратой сумуе вечар.

І я сумую. Песня тчэ
Ізноў кашулю развітання.
Жывыя мы с табой яшчэ...
Світанне, любы мой, світанне!

* * *

Прыціхла неба на плячах у сонца.
Бясконцы дзень на лес далонь кладзе.
Мы заблукалі ў жыце, сініх соснах
І ў канюшыне - залатой вадзе.

* * *

Падары мне гэты дзень,
Сон лясоў і смагу пожні,
Свой адбітак на вадзе,
Першы крок і крок апошні.

Падары гарачы ўздых,
Подых вольны і аддany...
Карані радкоў маіх —
Тыя згадкі, тыя раны.

* * *

Кроў лясоў паўночных — вершы
Намалюю залатым.
Я мастачка ночы першай,
Агнявой вады.

Далягляды, далягляды...
Мае косы — лён.
Сінім лёнам побач лягу,
Усцялю твой сон.

У адной руцэ — галубка,
У другой — сівы крумкач.
Калі любіш — не загубіш.
Смейся, доля! Плач!

* * *

Асцярожна: гэта поле —
Не спачын дарогі старай,
Не калыска майго болю,
Гэта — мары, гэта — мары.

Памірае лес і травы,
Каб вясною нарадзіцца.
Гэта поле — мае мары
І надзея адрадзіцца.

Палячу я жытнім рэхам
Ад грахоў, хаўтурных звонаў.
А ў палях — сцяблiны-стрэхі,
Сінім ветрам — крылы волі.

Веру я: вясною дужай,
Апантанай, ашалелай
Я ўпаду ў зялёны кужаль,
Выйду — маладой і смелай.

* * *

Проці ночы — сон сірочы
Пра цябе і пра мяне.
Бай у лапцях ціха крочыць, —
Можа гора абміне.

Проці ночы — сон пташыны:
З поўняй мы на самаце.
Медавіца-канюшына
На плячах яе расце.

Проці ночы — вешчы верас
Напрарочыць шчасце мне,
А табе, напэўна, вечнасць
Сярод пусткі і камней.

* * *

Соф'е Пятровай

Адлятаюць буслы, адлятаюць,
І буслінаю белаю — ты.
Завіруха палі замятае,
Слепіць вочы зямных святынь.

Пуцяводныя нітачкі долі
Рвуцца недзе на ўздыме дарог.
Завіруха царуе ў полі,
А на небе сумуе Бог.

Таямніцу адвечную знаеш,
Соф'я-птушка, сястра па крыві.
Залатыя лясы чакаюць
Тваёй ўсмешкі і дабрыні.

* * *

Не паспяваю жыць
не для сябе, для іншых,
І дарагіх людзей
губляю па чарзе.

Гараць мае лясы —
душу ўкрывае іней.
Гарыць мая зямля —
скляпенне сноў-надзей.

Не паспяваю жыць
за хлебам, не за срэбрам
І некалі сустрэць
сваіх сівых сяброў.

Ляціць, ляціць жыццё
да брамы ў лютым небе.
І не хапае сіл,
і не хапае слоў...

Парасткі

1
Камень гэты — пачатак травы,
Гартаваны кавалак карэння.
Веру я: ён жывы, агнявы,
Адзічэлы продак насення.

Камень гэты - пачатак дажджу,
Анямелы ад буры і ветру,
Бачыць ён развітання мяжу
І світанак прарошчвае ў вечар.

Гэта ён вучыць нас сталець.
Нават здрада яго не зламіла...
Ён ляжыць на роднай зямлі,
Значыць памятае пра крылы.

2
Ячменнае зерне — жыццё
Гарчыць, і гарыць, і смяецца...
Ў руцэ безпрытуллем — асцё,
І птушкаю ў небе — сэрца.

Сяўба прарасце ў абмалот,
Імчацца, сівеюць стагоддзі-
За вокнамі — новы год,
І новае зерне ўсходзіць.

А сэрцу час — трын-трава, -
Зару сустрэчамі мерыць.
І вучыць мяне трываць,
Кахаць, і марыць, і верыць.

3
Трава прарастае ў дажджы.
Сіротства маё ўтравела.
Дарога бяжыць, бяжыць,
Сівеюць косы, сівеюць...

Ад веку да веку — дажджы,
Астрогі, званіцы, пагосты...
Мне трэба за ўсіх дажыць,
Адмерыць золкія вёрсты.

Дарога бяжыць, бяжыць...
Трава прарастае ў сэрца:
«Хто ты на зямлі скажы,
А потым — не страшна ўмерці».

* * *

Ляціце, вятры, ляціце,
Лавіце мой дом, лавіце.
Я буду ценем на плячах мяцелі,
Апасля - цішынёй,
Я буду гукам, распраўлю рукі
Над соннай зямлёй.
Ляціце, вятры, ляціце,
Лавіце мой дом, лавіце...
Я — ваша пяшчота,
У сонечных сотах
Пачуеце голас мой.

З паэмы «іРагнеда»

1
Варажба

Чараўніца чаравала:
Подых, пёрка - і крыло...
Дзе зара была крывавай —
Пуцявіну замяло.
Як ляцеў па небу голуб,
Шызы голуб й залаты, —
Загубіўся ў лесе любы,
А нялюбы звёў масты.
Вёрсты, вёрсты... Снег патлаты
Азвярэў, нібыта воўк.
Сваты едуць, едуць сваты!
Чэзне свечка, ллецца воск...

2
Крумкач

Прыляцеў на падваконне,
У вачах — дажджы, дажджы...
Хто ты: шчасце або скон мой?
Любы, вораг мой, скажы.
Толькі чую — вецер, вецер...
Толькі бачу шлях завей.
Дзе ты лётаў, чорны свеце,
На якой заснеш траве?
І чыя душа жывая
Б'ецца, стукае ў вакно?
Дзе зара была крывавай,

Там дарогі замяло.
Крук самотны - крык адчайны.
Чую, чую - будзе kроў...
Над зямлёй маёй — маўчанне.
Чэзне ноч.

3
Уладзімір
А зараз ты — княгіня.
Спужалася чаго? -
Што Полацк твой загінуў
Ад погляда майго.
Што аўдавелі жонкі,
Што паляглі сыны?
Ты кажаш, што я жорсткі
І спапяліў дамы.
Сватоў я слаў па чэсці,
Табе свой біў паклон.
Я шанаваў бы цесця,
Як трэба, за сталом
Па келіху б мы ўзнялі
За вольны наш саюз,
Калі б ты не пракляла
Усю маю сям'ю.
Калі б ты не назвала
Рабычычам мяне,
Зязюля б не кувала
Сярод сівых камней.
І вёскі не гарэлі б,
Не распіналі б дзеў,
І рэкі не крывелі б...
Я на цябе глядзеў!
Сама цяпер рабыня,
Рагнеда-Гарыслава.
Калі зара астыне —
Ты будзеш гора славіць.

4
Рагнеда
А душа душою тужыць,
А душа душой баліць.
Я пляту з хмарынак кужаль,
Ён не ўмее гаварыць.

Па сцяжынчцы сірочай
Пабягу ў гушчар лясны,
Стану я сястрою воўчай
На імгненне, да вясны.

Стану я сястрою ночы,
Нашча сэрца — далягляд.
Вып'ю келіх — буду танчыць,
Пацячэ жыццё назад.

Я дзяўчынкай так любіла
На Дзвіну глядзець з гары.
Недзе спіць мой Полацк мілы,
А душа зарой гарыць...

Паляцела б я галубкай

Ці буслінай маладой.
Там мой бацька топіць грубку,
І жыве каханы мой.

На хвілінку, на імгненне
Палячу на край зямлі.
Там гаворыць і каменне,
У мядах цвітуць палі.

Хто маю душу палечыць?
Вунь крумкач на хвоі спіць, —
Пад крылом ракою вечнасць,
Я не ў змозе пераплыць.

Апаліла даль світанкам,
Тоне, тоне птушка-ночка...
А за ёю я падранкам.
А за мною сон сірочы.

5

Дзе гарэла папараць-кветка
Да зары,
Мне крумкач прынёс вестку.
— Гавары!
Гавары, пакуль вецер
Яшчэ родны, як брат.
Гавары, пакуль кветкі
Яшчэ сіла сабраць.
Пачакай, мая згуба,
Дыхай вольна душа.
Хто душу не галубіў —
Не напіўся з каўша.
Толькі кропля за кроплей
Пот каціўся, і кроў
Запякалася. Кросны
Ткалі зоркі без сноў.
І схіляліся песні
Да гаючай травы,
Там за права ўваскрэснуць
Йшлі ўміраць ваяры.
Мне каралі на шыі,
Як вяроўкі былі.
Я кашулю пашыла
Да зямлі, да зямлі...
А крумкач безпрытульны
(Ў зрэнках тухне зара):
— Хутка будзеш матуляй, —
Выгукнуў, як мара.
— Подых свечачкі-поўні,
Спомін траў і мядоў
Сэрца сына напоўніць.
Ён вярнецца дамоў...
Тут крумкач схамянуўся,
Да каменння прынік.
Ноч-матуля мінула.
Белы дзень — чорны крык.

6

Як дзіўна, сэрца, і як страшна:
Мой валадар адзіны — кат.

Ён люты, гожы і адважны
І мне яго чакаць, чакаць...
Вяшчунка-доля так няўтольна:
Напіўшыся маёй крыві,
Яна сказала непрытомнай:
«Кахай, Рагнеда, і жыві».
Мой князь, мой кат,
мой вораг любы,
Цябе Стрыбог на муку мне
Паслаў,
на невараць, на згубу,
На скон сярод нямых камней.
Гарэць, гарэць ў агні пякельным,
І ненавідзець, і кахаць...
Ды не ў палатах княжых — келлі
Цябе чакаць і праклінаць.

7

Пераверцень-трава, вярні сэрца.
Шэры дзень і шэрая ноч.
Некаханай лягчэй памерці
У прадонні гадоў і прошч.
Некаханай лягчэй да сонца,
Чым да сэрца каменнага зваць.
Дзе гняздзіцца тваё бяссонне?
Дзе твая, перасмешнік, рацьʼ?

8

Пякуча, балюча,
свет — здраджаны рай.
Народзіцца хлопчык,
а ты — памірай.
Не ўсмешкі, не ласкі —
адзін люты снег.
Тваё пацалункі -
і боль мой, і грэх.
Мне неба, як глеба,
на плечы лягло,
Я твару прыпомніць
не ўмею твайго.
І праўда нямее
ў крыклівых дварах,
Прызнацца не смею,
што кат ў галавах.
Стаіць у чырвоным
і пільна глядзіць,
Каб сына твайго
я змагла нарадзіць.

9

Ты мяне не пачуеш, як і заўсёды.
Спіш. Спеюць яблыкі. Сохне трава.
Я караць цябе буду сёння.
Няма болей сіл трываць.

Вось лязо і адбітак пачварны ў глыбінях
Гэтай бездані-поўні - жаночай слязы.
Ты такі малады ва ўспамінах,
Але ў сэрцы маім — маразы.

Замарозіў ты кветку. Я сёння пачвара.
Я — забойца. У скрусе стаю ля акна.
Дзе мая запаветная мара?
Дзе мая дарагая зямля?

Хіба лёгка забіць, калі жылка дрыжыць
На скроні тваёй, як жывая?
А ў вачах маіх — капяжы,

Будзе рана ў грудзях нажавая.
Як жа мне жыць, калі жылка дрыжыць,
І любыя дзеці паснулі?..
Напэўна, дайшла да мяжы
І зверу ўва мне няўтульна.
Ты, вораг мой, кат, вяртайся назад,
Туды, дзе пачатак дарогі,
Дзе маці маёй сляза
Абмыла бацькавы ногі.
Туды, дзе крывёй зара
І кроў на белай кашулі,
Дзе наша гарыць зямля —
Знайдзі свой спачын-прытулак.
Памры, мой каханы, ўраз!
Жыві, мой каханы, вечна!
Прымара зары, як мара,
Сціскае за плечы... Уладзімір

10

Уладзімір

Што ты робіш тут, Гарыслава?
Чаму твае рукі ў крыві?
Якое ты маеш права
Паміраць? Я сказаў — жыві!

Ці, можа, маёй ты смерці
Жадаеш. Чаго дрыжыш?
З табой нам доля адмерыла
Ісці па адным крыжы.

Мяжуе нянавісць з каханнем,
Мяжуе з жалем праклён,
Я першы твой і астатні,
Жах твой і лепшы сон.

Навошта сябе ты губіш?
Забудзь усё злое, забудзь!
Знякровіла помста губы,
Жаданаю жонкай будзь!

Знаеш, і мне, Гарыслава,
Памяць урочыць сны...
Ды лепшая мая слава —
Наша дачка і сыны.

Знаю — табе няўцешна,
Знаю — табе баліць...
Толькі святлу без ценю

Не бываць на зямлі.

11

Рукі тваe халодныя,
Прыгалубь, Гарыслава.
Лёдам ты дыхаеш, лёдам.
Атрута — кожная страва.

Раўнуеш, напэўна? Ведаю
Жанчын я іншых, гарачых,
Толькі з табою-ведзьмаю,
Нібы ў дзяцінстве, плачу.

Літасцівы, мо, ягнёнак,
Хіба ты не ведаеш, як
Чакаю я нашае ночы? —
Як срэбнай манеты жабрак,

Як жытняга хлеба галодны,
Як каня кроплю дажджу...
А ты мне пад сэрца — лёдам,
А ты — паміж намі мяжу.

Рагнеда мая, Гарыслава,
Сцябліна на поўні дарог...
Калі б ты была ласкавай,
Я б сэрца сваё збярог.

12

Пераўтварэнне

Дзіўны сон мне сёння сніўся:
Я — дзяўчынка. Церам наш
Быццам купал сіні-сіні...
Нехта кажа ціха: «Ляж...»

І падлога ўраз травою
Прарасла і зацвіла.
Я пазнала яе мову,
Бо цвіла травою я.

Я была расой сусвету,
Верасоваю зарой,
Я была вадой і ветрам,
Голасам лясных звяроў...

Дзіўны сон, а можа памяць:
Кроў мая — лясы, палі...
Той агонь пакуту паліць,
Як салому на зямлі.

13

Дождж пралiецца —
                    стане светла душам.
На могілках падымецца трава.
                    І будзе вецер
          песні маці слухаць,
А бацькава сівая галава
Вярбінаю нахіліцца да долу,

Да долу, да крыніцы,
да раллі...
Ваша дачка ўжо хутка будзе дома,
Яе краса,
нібы быльнёг,
згарыць.
І будзе вечнасць
спапяляць імгненні,
А воля захлынацца у крыві.
Рагнеда крыж сумленна будзе несці
Далёка ад радзімае зямлі.
«Дачушка, кветачка, —
Рагнедзе сніцца маці, —
Як дакранешся сонечнай мяжы,
Пабачыш дзень
і будуць дзверы насцеж,
Душу сваю,
як неруш,
зберажы».

14

Кажуць, дарога да храма,
Храм - у душы.
Рана мне, Божа, рана
Да нябесных вяршынь.

Чорная хустка — здрада,
Белая хустка — лёс...
Бацюхна-бусел параду
Мне на крылах прынёс.

Келля — мая цямніца,
Сэрца — мой храм.
Гэтыя вербы ніцыя
Нікому я не аддам.

Гэтыя рукі белыя
Параю лебядзей
Крыж накладаюць смела
На рабацінне ў вадзе.

Вобраз твой, Уладзімір,
Хутка ў вадзе згарыць:
Люты, спачыне з мірам,
Міламу ў сэрцы жыць.

15

Мой сынок, паглядзі на мяне,
Ты хіба не пазнаў матулю?
Я канаю сярод камней
Сівой ластаўкай беспрытульнай.

Толькі вочы яшчэ гараць.
У іх помста і памяць волі.
Маё сэрца даўно кара,
Не скарuся ні кату, ні долі.

Княжа мой, пакладзі ў труну
Васілёчкі з палёў радзімых,
І свяшчэнную даўніну,
І гаротны погляд Радзімы.

Абдымі мяне, неба, мацней.
Дзе кайданы хароняць песні,
Прыгайце, людзі, мяне,
Калі я аднойчы ўваскрэсну.

16
У доме маім два акна,
Два розных жыцці-дарогі:
У першым — прывід вайны,
Ў другім — прыгажосць ад Бога.

Змяшаліся попел і кроў,
А хочацца жыць і маліцца.
Даўно чалавека баіцца
Світанак - прыстанак буслоў.

У першым акне — зіма,
Закідвае смецце парогі.
Тут кат чалавек дарагі,
І шыбеніцы, і астрогі...

Будуюць цэрквы ў другім,
Дзіцяці смяецца чыста...
Вокны мае — берагі,
Я рэчкай плыву агністай.

Змест

«Адным радком памкнуўся лес да сонца...»
«Неба ў далонях калыша кветкі...»
«Дождж праліецца - стане светла душам...»
Дождж
«Пастарайся проста выжыць...»
«А кнігаўка крычала над вадой...»
«Лета крылы свае дарыла...»
«Мы выйшлі з дажджу, як з вайны...»
«Пройдзе зіма пералескамі...»
«Не гнявіся на мяне...»
«Восенню сіняй, слотнай зімою...»
«Па вячэрняй па зарэ...»
«Прыбяры мяне ў белае, поўня...»
Радзіме
«Палячы мяне, лекар-вецер...»
«Той, хто народзіцца вольны, як вецер...»
«Ляціць жыццё. Зіма майструе сані...»
«Зіма без снегу, як без сэрца...»
Развітанне
«Берагі бліжэй за сэрца...»
«Сіні лес расце ля ракі...»
«Мне вятроў сівая роспач...»
«Пасцялю на світанку настольнік...»
«Па зямлі зямное пройдзе...»
«Берагамі сіні сон...»
«Я песні пакіну журлівым вятрам...»
«Калі не стане ні трывог, ні жалю...»
« Мае лясы ўпляліся ў неба...»
«Па беламу — трава...»
Радзіме
«Пераверцень-трава...»
Сон
«Вечар-вецер...»
«Калі шчарнее дзень...»
«Вечарам-сажай...»
«Так цяжка дадому вяртацца...»
«Крумкачы, крумкачы...»
«А ў далонях яго — жывая вада...»
«Крылы сэрцу не па размеру...»
«Хто хоча мяне зразумець...»
«Сіні дзень...»
«Дзіўны бярозавы дзень...»
«Пра сонца напішаш золатам...»
«Вачэй не пазнаю і крыл...»
«І прыляціць крумкач няўмольны...»
«За воляю сорак год...»
«Сон-трава кранае сэрца...»
Сем крокаў
Каня
«Маё каханне — у барах...»
«Бура, бура, я — жывая...»
«Ты мяне на руках панясеш...»
«Гавары са мной, гавары...»
«Я спяю табе пра мора...»
Лета
«Спявай, вярбіна, спявай...»
«Я была зарою...»
«Заліўныя лугі — каляровыя...»
«Мы вярталіся дадому...»
«Прачынаемся разам з птушкамі...»

Аўтар выказвае шчырую падзяку дырэктару
спецыялізаванай вырабніча-камерцыйнай
фірмы «Електронасос-сервіс», старшыні
Палтаўскага абласнога благадзейнага фонду
«Надвечір'я» Светлане Якаўлевай
за чынны ў д з е л у выданні гэтай кнігі